УДК 908 (476.7)

# ВЫНІКІ І ЎРОКІ КАРНАЙ АПЕРАЦЫІ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК “ГОРНУНГ”, ПРАВЕДЗЕНАЙ СУПРАЦЬ МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПІНСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗОНЫ

***В.М. Палячок****, вучаніца ліцэя ПалесДУ, XI “Б” клас*

*Навуковы кіраўнік –* ***М.В. Цуба****, к.г.н., дацэнт*

***Палескі дзяржаўны ўніверсітэт***

З часу вызвалення беларускіх земляў прайшло больш 70–ці гадоў, аднак не ўсе пытанні гісторыі вайны дастаткова распрацаваны ў гісторыяграфіі. Адным з іх з’яўляецца вывучэнне карных аперацый нацыстаў па знішчэнні партызан і мірнага насельніцтва. Даследаванні ў гэтым накірунку ёсць, але яны ў асноўным датычацца знішчэння яўрэйскага насельніцтва. Разам з тым, стопрацэнтныя знішчэнне падчас карных аперацый партызан і мірнага беларускага насельніцтва ў партызанскіх зонах па сённяшні дзень застаецца маладаследаваным і з’яўляецца адной з “белых плям” айчыннай гісторыі.

Вывучэнне адной з найбольш трагічных старонак нашай гісторыі, асвятленне абставін, маштабаў, незвычайнай жорсткасці карных экспедыцый, у тым ліку і аперацыі “Горнунг” (Люты), на беларускіх землях у лёсавызначальны перыяд Другой сусветнай вайны з’яўляецца актуальнай праблемай і ў наш час. Абумоўлена гэта не толькі ўзрастаючым інтарэсам беларусаў да пазнання ваеннай гісторыі свайго краю, але і да падзей у суседняй Украіне, а таксама ў іншых гарачых кропках Зямлі, дзе ахвярамі ваенных дзеянняў становіцца ні ў чым не вінаватае мірнае насельніцтва.

Напярэдадні зімы 1942–1943 гг. партызанская зона, якая была пад кантролем Пінскага партызанскага злучэння, пашырылася на ўсю тэрыторыю Ленінскага, Ганцавіцкага, значную частку Лунінецкага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага і Іванаўскага раёнаў. У самым канцы 1942 года ў раён сканцэнтравання пінскіх партызан прыбыло і злучэнне ўкраінскіх партызан на чале з С.А.Каўпаком. Безумоўна, канцэнтрацыя такіх значных партызанскіх сіл, як злучэнні Каржа і Каўпака ў адным рэгіёне, не засталіся незаўважанымі для германскіх войск. Немцы вырашылі выкарыстаць гэтыя абставіны не толькі для барацьбы з партызанскім рухам, але і для расправы над мірным насельніцтвам. У выніку колькасць войск вермахта, задзейнічаных у аперацыі пад кодавай назвай “Горнунг” (Люты) склала каля дваццаці тысяч чалавек [1, с.31]. У загадзе на гэтую карную аперацыю адзначалася, што раён аперацыі – “сапраўдная Савецкая рэспубліка”, дзе адноўлены мясцовыя органы Савецкай улады, камендатуры, праводзіцца агульная мабілізацыя. У сувязі з чым усім сілам карнікаў загадваецца ў гэтым раёне знішчыць усё, “што можа служыць абаронай і жыллём”, ператварыць раён у “нікім не занятую прастору, мясцовае насельніцтва расстраляць жывёлу, збожжа і прадукты забраць” [2, с.334]. 10 лютага адбылася першая атака карнікаў супраць партызан атрада імя Кірава. Каб захаваць злучэнне і пазбегнуць вялікіх страт, было вырашана адыходзіць у іншыя месцы, манеўраваць, рабіць на праціўніка нечаканыя напады і вылазкі. І ўсё ж пад націскам лепш узброенага і значна пераўзыходзячага ў жывой сіле праціўніка, атрады Пінскага злучэння вымушаны былі адыходзіць назад на Хорастаўшчыну, дзе замкнулася кальцо акружэння [2, с.334]. Ноччу з 12 на 13 лютага 1943 года галоўныя сілы партызан і частка мясцовага мірнага насельніцтва змаглі вырвацца з акружэння. Аднак фашысты прыступілі да актыўных дзеянняў супраць застаўшыхся мірных жыхароў і астаўленага для іх аховы невялікага партызанскага атрада. На ўзбраенні карнікаў меліся лёгкія танкі, гарматы, буйнакаліберныя кулямёты і іншая стралковая зброя. Такім чынам з 13 лютага 1943 года карнікі распачалі масавае знішчэнне мірнага беларускага насельніцтва ў партызанскай зоне.

Ёсць успаміны ад відавочцы гэтых падзей, вядомага польскага святара Францішка Кубша: “Ад людзей я даведаўся, што гітлераўцы загналі ўсіх жыхароў Чаланца, Хорастава і частку жыхароў Пузічаў, а таксама Рахавічаў, мужчын, жанчын і дзяцей на вялікі двор сядзібы ( ваколіца вёскі Хорастава), для выконвання масавай экзэкуцыі. Людзі плакалі, дзеці крычалі, многія маліліся аб дараванні ім жыцця дзеля ўсяго святога. Праваслаўны святар бачучы, што немцы накіроўваюць ствалы кулямётаў на сваіх ахвяр, папрасіў усіх супакоіцца і дазволіў сказаць некалькі слоў. Узышоў на ўзгорак і, звяртаючыся да ўсіх прысутных, сказаў, каб усе прыгатаваліся да сустрэчы з усявышнім. Разбудзіў словамі смутак за зробленныя грахі і адпусціў усім грахі. Калі хацеў разам з усімі вымавіць малітву – грохнуў кулямётны залп. Загінуў справядлівы “бацюшка” разам з сваёй сям’ёй, загінулі яго і мае прыхаджанне”[3, с.67]. Карціны неапраўданай жорсткасці і варварскага знішчэння ўсяго жывога сінхрона паўтараюцца кожнай карнай камандай ва ўсіх палескіх вёсках. У вёсцы Яскавічы размяшчалася партызанская камендатура. Насельніцтва было інфармавана аб маючым адбыцца падыходзе карнікаў. Але не ўсе паспелі схавацца ў навакольных лясах. Па ўспамінах жыхаркі Ясковічы, якая засталася жывая, Галіны Іванаўны Чаравака ўсіх тых, хто не паспеў схавацца, карнікі заганялі і палілі ва ўласных дамах. У пякельным полымі жыўцом загінулі 305 жыхароў гэтай вёскі. Почырк адзін і той жа – безжалобнае татальнае знішчэнне.Вялікую каштоўнасць для аднаўлення сапраўднай трагедыі лютаўскага пабоішча ўяўляюць таксама ўспаміны нашага славутага земляка, паэта, празаіка Уладзіслава Іосіфавіча Нядзьвецкага. Драму роднай вёскі Рахавічы ён перажыў трынаццацігадовым падлеткам. Гэтая трагедыя стала пасля нязменнай тэмай яго творчасці. Вось што пісаў Уладзіслаў аб тых трагічных днях у сваёй біяграфіі: "У лютым 1943 года наш былы Ленінскі раён з усіх бакоў атачылі каля трыццаці тысяч фашысцкіх войск. Пачалася блакада, а потым аблава. Хаваліся людзі ў лесах. Але схавацца было вельмі цяжка– карнікі прачэсвалі ўсю мясцовасць, палілі ўсё, што траплялася на вочы, забівалі таксама ўсіх без выключэння.З нашых Раховіч падчас блакады загінула каля трохсот жыхароў. "[4.с.159] Па меркаванні гісторыка К. Герлаха, батальён Дырлевангера спаліў вёску Пузічы (780 ахвяр). Аднак іншы навуковец В. Паліла, спасылаючыся на матэрыялы судовага працэсу супраць аднаго з бы-



Полесгу

лых афіцэраў ахоўнай паліцыі сумняваецца ў тым, што гэта было зроблена батальёнам Дырлевангера.Ён сцвярджае, абапіраючыся на сведчанні гэтага афіцэра, што вёску Пузічы знішчыў 18 батальён ахоўнай паліцыі (баявая група “Захад”) [5]. Не так важна, хто з дадзенных даследчыкаў болей праў, але знішчэнне вёскі Пузічы адбывалася па наступнаму сцэнарыю.Аб чым ёсць занатаваныя даследчыкам А.Ф.Ясько, ўспаміны відавочцаў аб знішчэнні карнікамі яго роднай вёскі Пузічы. З запісу вынікаў, што раніцай 15 лютага вялікая колькасць людзей з вёскі Пузічы і суседніх вёсак была выгнана карнікамі з навакольных лясоў і балот, дзе яны імкнуліся захавацца. Дадзены натоўп людзей быў прыгнаны гітлераўскімі злачынцамі да былой панскай сядзібы (ваколіца вёскі Пузічы), дзе знаходзіўся вялікі драўляны кароўнік з саломенай страхой, разлічаны на 60–70 адзінак жывёлы. У гэтым натоўпе адчайна ў роспачы галасілі жанчыны, плакалі маленькія дзеці, а карнікі распачалі разыгрываць нікому не патрэбную інсцыніроўку з праверкай дакументаў. Пры гэтым у каго былі дакументы, і ў тых у каго іх не аказалася, усяроўна заштурхоўвалі ў кароўнік. Тут жа эсэсаўцамі былі адабраны два дзясяткі маладых мужчын і жанчын, якіх адвялі ў бок. Як затым высветліцца, дзеля перагону нарабаванай жывёлы. Менавіта, яны і з’явіліся тымі нешматлікімі відавочцамі жудаснага знішчэння сваіх аднавяскоўцаў, суседзяў, родных і блізкіх. Усіх астатніх эсэсаўцы заштурхнулі ў хлеў шчыльнымі радамі, “як сялёдку ў бочцы”. Стаяць можна было толькі моцна прыжаўшыся адзін да аднаго, апусціўшы рукі.Тут жа сцены хлява аблілі бензінам і падпалілі. У адно імгненне вока кароўнік запылаў. Саломенная страха хутка прагарэла і ў лічаныя хвіліны з грохатам звалілася на галовы нясчасных. Далёка былі чуваць іх крыкі ад нясцерпнай болі. Гарэлі валасы, гарэлі твары і адзенне стаячых шчыльным гуртам аднавяскоўцаў. Бацькі прыжымалі да сябе маленькіх дзетак, апускалі іх уніз да зямлі, куды яшчэ не дабралася ўсепаглынальнае полымя. Стаячыя бліжэй да прасценкаў бацькі, пасля таго, як упала прагарэўшая саломенная страха, перакідвалі сваіх немаўлят праз пылаючыя сцены хлява. Па загаду наглядаўшых за ўсім гэтым эсэсаўцаў стаячыя ў ачапленні прыслужлівыя латышы з падраздзялення Рубеніса падхоплівалі скруткі, што дыміліся з моцна крычачымі малышамі і кідалі іх назад у пылаючы касцёр. Відавочцы расказвалі, што страшэнныя, дзікія крыкі і стогны гібнучых у жудасных пакутах людзей заглушалі гул і трэск велізарнага кастра, у які за некалькі хвілін ператварыўся былы панскі кароўнік. 780 чалавек тут навечна засталіся ў брацкай магіле. Сярод іх дзесяткі грудных немаўлят [ 4, с.182–184], [4, с.227].

У выніку вышэй адзначаных злачынстваў спынілі сваё існаванне шматлікія вёскі Пінскай партызанскай зоны. Зніклі многія кланы, роды, прозвішчы людзей гэтых вёсак. Гэта і па сённяшні дзень незажываючая, краваточывая рана для жыхароў палескага краю.

У ходзе даследавання зроблены наступныя высновы:

Карная аперацыя “Горнунг”, як і іншыя падобныя аперацыі германскіх агрэсараў – гэта загадзя распрацаваны мэтанакіраваны план генацыду супраць насельніцтва на захопленых тэрыторыях.

Карная аперацыя “Горнунг” вызначылася надзвычайнай жорсткасцю. Разумеючы, што Пінскае партызанскае злучэнне разграміць не ўдалося, так як яно з часткай насельніцтва прарвала блакаду і выйшла з акружэння. Карнікі вырашылі спагнаць злосць на мірных жыхарах, якія засталіся ў партызанскай зоне. Прычым згодна з патрабаваннем германскага камандавання загадвалася “выкарыстоўваць любыя сродкі без абмежавання, таксама супраць жанчын і дзяцей”.

Фактычна ўсе вёскі Хорастаўскага рэгіёну былі спалены дашчэнту разам з жыхарамі. Хто змог выбрацца з агню, тых расстрэльвалі. Некалькі вёсак партызанскай зоны ўвогуле не былі адноўлены, тым самым раздзяліўшы лёс Хатыні.

У выніку карнай аперацыі “Горнунг” загінуў кожны трэці жыхар партызанскай зоны. Сёння на месцах здзеклівых пакут і смерці тысяч людзей збудаваны мемарыялы. Гэта месцы – плача, малітвы і пакаяння, а не славутасці, на фоне якіх можна фатаграфавацца. Наведванне такіх мемарыялаў павінна адпавядаць этыкету месца знаходжання наведвальнікаў і надляжачым іх паводзінам.

Практычная значнасць дадзенай работы заключаецца ў тым, што новыя факты, прыведзеныя высновы і аргументы могуць быць выкарыстаны пры далейшым афармленні экспазіцыі ў музеі Партызанскай Славы імя В.З. Каржа, школьных музеяў, у бібліятэках, пры прывядзенні жалобных мерапрыемстваў, прысвечаных памяці пра вайну.

**Спісак крыніц літаратуры**

1. Цуба, М.В. Жыццё і подзвіг братоў Цубаў/ М. В. Цуба. – Пінск: ПалесДУ, 2013. – 73 с.

2. Памяць: Гіст.–дакум. Хроніка Лунінецкага раёна / укл. Т.В. Канапацкая. – Мінск: Беларусь, 1995. – 716 с.

ПолесГУ

3. Zieliński, Ze Wshodu Z  KAPELANEM/ S.Zieliński//–Warszawa. Wydawnictwo Vipart, 1997. – 160s.
4. Ясько, А.Ф. Больно даже мёртвым: Полесская трагедия/ А.Ф. Ясько. – Минск: Бонем, 2012. – 400с.; Адамович, А., Брыль, Я., Калесник, В. Я из огненной деревни/ А.Адамович, Я.Брыль, В.Калесник. – Москва: СП, 1991. – 375 с.
5. НАРБ. Фонд 4683. –  Воп.3. – Спр. 930. – Арк. 155–157.
ПолесГУ